# Магчымасці супольнай працы

**Саюз пісьменнікаў Беларусі цесна супрацоўнічае з Нацыянальнай бібліятэкай краіны. На пляцоўках гэтага асветніцкага цэнтра праходзяць прэзентацыі кніжных навінак, святкаванне пісьменніцкіх юбілеяў, іншыя мерапрыемствы з удзелам паэтаў, празаікаў, літаратуразнаўцаў краіны.**

На нядаўняй сустрэчы генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзіма Гігіна і старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Карлюкевіча вялася размова пра падрыхтоўку Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж НББ і СПБ, пра фарміраванне канкрэтнага плана супольнай дзейнасці па прапагандзе кніжнага чытання. Вадзім Францавіч выказаў згоду падтрымаць правядзенне традыцыйнага фестывалю дзіцячай літаратуры «У гасцях у Францыска Скарыны», які і сёлета будзе арганізаваны на плошчы каля бібліятэкі. Суразмоўцы звярнулі ўвагу на Парк пісьменнікаў, адзначылі яго магчымасці ў мемарыялізацыі іменаў народных пісьменнікаў Беларусі, класікаў беларускай літаратуры.

Удзел у сустрэчы прыняў публіцыст, краязнаўца, лаўрэат Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», Уладзімір Ліхадзедаў. Ён актыўна супрацоўнічае з Нацыянальнай бібліятэкай. Гаворка ішла пра прэзентацыю ў сценах галоўнай кніжніцы краіны аўтарскага праекта — серыі альбомаў «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». Праект падтрыманы Міністэрствам інфармацыі. Мяркуецца, што будуць прадстаўлены новыя выдавецкія здабыткі У. Ліхадзедава. Адзін з альбомаў серыі падрыхтаваны да XXX Дня беларускага пісьменства ў Гарадку — «Ад Віцебска да Полацка». У хуткім часе кніга пабачыць свет у Выдавецкім доме «Звязда».

**Кірыл ЛАДУЦЬКА**